Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкавіцкі навучальна -педагагічны комплекс
дзіцячы сад - сярэдняя школа»

# Гульня -знаёмства

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

аг. Грыцкевічы, 2022

У дашкольным дзяцінстве ўпершыню ўзнікае дзейнасць, свабодная ад уплыву дарослых, - зносіны з аднагодкамі. Ад таго наколькі паспяхова складваюцца гэтыя зносіны, залежыць тэмп развіцця дзіцяці, яго самаадчуванне, самаацэнка, стаўленне да іншых людзей. Дашкольнік не можа абысціся без аднагодкаў, аднак, яго зносіны з імі без дапамогі дарослых амаль заўсёды аказваюцца малаэфектыўнымі. Дзіцяці трэба вучыць выяўляць свае эмоцыі і жаданні, спачуваць і дапамагаць іншаму чалавеку, годна выходзіць з канфліктнай сітуацыі, мірыцца, адрозніваць дапушчальныя і недапушчальныя паводзіны. У гэтым нам дапамогуць гульні.

Гульня – знаёмства "Назаві сябе."

Мэта: развіваць уменне знаёміцца адзін з адным.

Ход гульні: дзеці становяцца ў кола. Кожны ўдзельнік па чарзе называе сябе па імені (калі хоча, можа нешта расказаць пра сябе).

Гульня – знаёмства «Мяне завуць…»

Мэта: развіваць уменне запамінаць імёны адзін аднаго, устанаўліваць кантакт.

Ход гульні: дзеці становяцца ў кола. Першы ўдзельнік (напрыклад, злева ад вядучага) называе сваё імя. Наступны паўтарае яго, і, называе сваё. І так па коле. Практыкаванне заканчваецца, калі першы ўдзельнік назаве па імёнах усю группу.

Гульня «Назаві ласкава суседа»

Мэта: развіццё ўмення запамінаць імёны адзін аднаго, садзейнічць стварэнню камфортнага становішча для кожнага ўдзельніка.

Ход гульні: дзеці становяцца ў кола. Па чарзе кідаюць адзін аднаму мячык. І той, да каго мячык патрапіць, называе адно ці некалькі сваіх ласкавых імёнаў. Акрамя таго, важна запомніць, хто каму кінуў мячык. Калі ўсе дзеці назавуць свае ласкавыя імёны, мячык пойдзе ў адваротны бок. Цяпер трэба старацца не пераблытаць і кінуць мяч таму, хто ўпершыню кінуў яго вам, а, акрамя таго, вымавіць яго ласкавае імя.